Правомерными являются меры по задержанию, которыми причиняется меньший, равный и даже несколько больший вред, чем тот, который был необходим для задержания. Закон запрещает причинение преступнику только такого вреда, который существенно превышает опасность преступления и не вызывается обстановкой задержания.

В законодательстве других стран мира право на задержание преступника формулируется по-разному.

Уголовный кодекс Латвии в явной форме устанавливает границы вреда, причиняемого при задержании: если преступление причинило материальный ущерб, допустимо причинение задерживаемому легкого или менее тяжкого телесного повреждения; если это лицо совершило убийство — допустимо причинение тяжкого телесного повреждения, но лишь в случае, если такое лицо нельзя задержать иным способом (ст. 142).

Таким образом, с учетом изложенного представляется целесообразным установить определенные границы вреда в статье 35 Уголовного кодекса Республики Беларусь.

**Литература**

1. Научно-практический комментарий к Уголовному кодексу Республики Беларусь / Н. Ф. Ахраменка [и др.] ; под ред. А. В. Баркова, В. М. Хомича. — 2-е изд., с изм. и доп. — Минск : ГИУСТ БГУ, 2010. — 1064 с.

2. Уголовный кодекс Республики Беларусь : 9 июля У-26 1999 г. № 275-З : текст по состоянию на 10 февраля 2009 г. — Минск : Амалфея, 2009. — 352 с.

# Ідэалогія амерыканскіх рабаўладальнікаў

*Ермакоў Я. С., студ. II к. ГДУ імя Ф. Скарыны,*
*навук. кір. Чаропка С. А., канд. гіст. навук, дац.*

Ідэалогія амерыканскага рабаўладальніцтва была арганічнай часткай існавання самой сістэмы рабства ў ЗША. Між тым яна з’явілася ў Злучаных Штатах не разам з рабствам, а пасля некалькіх стагоддзяў, прыкладна ў 20–30-я гг. XIX ст. Менавіта ў гэтыя дзесяцігоддзі рабаўладальнікі здабылі тую сілу, якая дазволіла ім аформіць сваю ідэалогію [1, с. 51]. Варта адзначыць, што гэтая ідэалогія не з’яўлялася адным цэлым. Можна сказаць, што ў рабаўладальнікаў ЗША не было агульнапрынятай ідэалогіі. Гэта было звязана з тым, што яна спалучала некалькі ідэалагічных плыняў, часам супярэчлівых. Яны будуць разгледжаны ніжэй. Складальнікамі іх былі знакамітыя паўднёва-амерыканскія палітыкі, філосафы і навукоўцы. Гэта, перш за ўсё, Д. К. Кэлхун, Д. Фіцхью,

Д. Д. Боў, Д. Нотт, У. Сіммс, Т. Р. Дзью, С. Картрайт і інш. [1, с. 53–67]. Існаванне некалькіх плыняў у рабаўладальніцкай ідэалогіі абгрунтоўваецца тым, што існавала мноства поглядаў на розныя бакі рабства. Гэтымі бакамі з'яўляюцца палітычны, сацыяльна-эканамічны, маральна-этычны і «навуковы» аспекты. Ніжэй будуць разгледжаны асноўныя плыні ў гэтых аспектах рабства.

Так, напрыклад, палітычны аспект у сістэме ідэалогіі рабства быў прадстаўлены Д. К. Кэлхунам. Палітыка для яго была інструментам абароны сацыяльна-эканамічных інтарэсаў рабаўладальніцкіх штатаў. Ён сцвярджаў, што калі любы федэральны закон пагражае суверэнітэту штата, то ён можа быць абвешчаны несапраўдным. Але Кангрэс ЗША меў права абараняць прыняты ім закон. Вось тут на дапамогу прыходзіць права выхаду асобных штатаў з саюза. Развіваючы далей сваю думку, Д. Кэлхун прыйшоў да высновы, што ЗША павінны мець двух прэзідэнтаў, якія прадстаўляюць розныя рэгіёны краіны [1, с. 55–59]. Як відаць, Д. К. Кэлхун у сваіх разважаннях карыстаўся дэмакратычнымі прынцыпамі для абароны сістэмы рабства на Поўдні ЗША, але гэтыя прынцыпы ён тлумачыў па сваім меркаванні.

З палітычным аспектам ідэалогіі рабства непарыўна звязаны сацыяльна-эканамічны. У асноўным ён быў звязаны з крытыкай капіталістычнага ўкладу. Акрамя Кэлхуна ў гэтым кірунку працаваў і Д. Фіцхью. І тут ён звяртаецца да рабства, і адзначае, што яно было заснавана на бацькоўскім клопаце рабаўладальнікаў да рабоў. У такіх умовах Фіцхью ўвогуле прапаноўваў, каб рабаўладальніцкая сістэма развівалася па прынцыпу аўтаркіі, калі сувязі паміж іншымі краінамі абмяжоўваліся толькі экспартам бавоўны на сусветны рынак [1, с. 63].

Тут трэба звярнуць увагу на яшчэ адзін аспект рабаўладальніцкай ідэалогіі — на маральна-этычны. Гэты аспект быў звязаны з натуральнымі правамі чалавека і таксама быў накіраваны на супрацьпастаўленне сістэмы рабства з капіталістычным укладам Поўначы. Калі Кэлхун увогуле не ставіў пад сумненне іх існавання, то Фіцхью сцьвярджаў, што натуральныя правы дакладна не сумяшчальныя з прынцыпамі дэмакратыі, што яны існуюць не для ўсіх белых. Такім чынам, як сцвярджаў Фіцхью, над некаторымі белымі павінен быць усталяваны кантроль, рабства, якое будзе найлепшым становішчам для іх [1, с. 62].

І тут трэба адзначыць, што ў асноўным плантатары грунтаваліся на прынцыпе прававой няроўнасці белых і чорных людзей. Асаблівае месца ў гэтым кірунку займала царква на Поўдні. Прапаведнікі і святары шукалі ў Свяшчэнным Пісанні выказванні пра тое, што чорныя павінны падпарадкоўвацца гаспадарам. Ім таксама казалі, што калі яны гэтага рабіць не будуць, то яны пасля смерць трапяць у ад [2, с. 213–214]. Такім чынам, рэлігія ў руках плантатараў з'яўлялася сродкам ціску на неграў-рабоў і маральнага апраўдання іх рабаўладальніцкай сістэмы на Поўдні ЗША.

Апошні аспект, «навуковы», з'яўляецца найбольш распрацаваным. Гэта можна патлумачыць тым, што ён грунтуецца на некаторых «навуковых» даследаваннях і канцэпцыях. У асноўным гэты аспект прадстаўлены расісцкім падыходам да рабства, які быў распрацаваны У. Сімсам, Д. Нотам, Т. Р. Дзью, С. Картрайтам і інш. [1, с. 65–67]. Не ўсе іх думкі выходзілі з аднаго тэзіса, але ўсе яны ў сваіх разважаннях прыходзілі да аднаго: чорная раса — гэта другая раса пасля белай, і таму над неграмі павінен быць усталяваны кантроль белай расы. Напрыклад, вядомы расісцкі антраполаг С. Картрайт пісаў, што рэчыва, ад якога залежыць колер скуры неграў, знаходзіцца не толькі там, але і ў іх мозгу, нервовай сістэме і цяглічнай тканіне. Ад яе таксама залежаць і іх паводзіны, якія адрозніваюцца ад паводзін белых [1, с. 67]. Гэта дало для ідэолагаў рабства падставу сцвярджаць, што рабаўладальніцтва для неграў з'яўляецца найлепшым становішчам, якое можа змяніцца толькі пры змене скуры, а гэта выключаецца законамі прыроды.

Такім чынам, ідэалогія амерыканскага рабаўладальніцтва як сістэма абгрунтавання рабства на тэрыторыі Поўдня ЗША была дастаткова развітой. Гэта нават нягледзячы на тое, што яна пачала з'яўляцца прыкладна ў 20–30-я гг. XIX ст. Аднак трэба адзначыць, што гэтая ідэалогія з'яўлялася шырмай, якая павінна была схаваць сапраўдны стан нявольніка і сістэмы рабства на Поўдні ЗША. Бо сама сістэма рабства была архаічнай з'явай для Новага часу, а, значыцца, і яе ідэалогія не зусім адпавядала рэчаіснасці, дзе ўжо панавала ідэалогія капіталізму.

**Літаратура**

1. Согрин, В. В. Идеология в американской истории : от отцов-основателей до конца XX века / В. В. Согрин. — М. : Наука, 1995. — 238 с.

2. Фостер, У. З. Негритянский народ в истории Америки / У. З. Фостер. — М. : Иностранная литература, 1955. — 806 с.

# Восстановление жилищного фонда в г. Бресте в послевоенный период (1944–1950-е гг.)

*Занько Е. Ю., асп. БрГУ им. А. С. Пушкина,*
*науч. рук. Вабищевич А. Н., д-р ист. наук, доц.*

За годы оккупации в БССР фашистские захватчики сожгли и разрушили 209 городов и районных центров, 9200 деревень и сел [1, с. 44]. 28 июля 1944 г. Брест был освобожден от немецко-фашистских захватчиков, началось возрождение города, практически уничтоженного в годы Великой Отечественной войны. По Брестской области были полностью уничтожены